**Турызм, як вядома, не ведае межаў. Нават 2-гадзіннае праходжанне дзяржаўнай мяжы паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча зусім не стаміла ўдзельнікаў праграмы прафесійнай мабільнасці "Выкарыстанне рэсурсаў экскурсійнай і краязнаўчай дзейнасці ў сучасным адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Рэспублікі Польшча", якую падрыхтавалі Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства сумесна з Польскім турыстычна-краязнаўчым таварыствам пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча. Пашпартны кантроль, аўтамабільная чарга — усё гэта толькі ўзмацніла радасць сустрэчы з польскімі калегамі.**



# Serdecznie witamy



## Гасцінныя людзі

У першыя чатыры дні зімы нас чакала насычанае знаёмства з прадстаўнікамі Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства, наведванне турыстычных і маладзёжных баз краіны-суседкі, прагулкі па брукаваных вулачках Любліна і Кракава. Гэтыя старадаўнія гарады невыпадкова былі выбраны месцамі рэалізацыі праграмы прафесійнай мабільнасці. Люблін і Кракаў славяцца не толькі вялікай колькасцю помнікаў архітэктуры, але і развітой турыстычнай інфраструктурай. Нам сапраўды было на што паглядзець і з чым азнаёміцца. Польскія калегі гасцінна сустракалі, а мы ветліва ўсміхаліся, зацікаўлена расказвалі, а мы ўважліва слухалі, актыўна паказвалі, а мы з цікаўнасцю разглядвалі і ў самых патаемных куточках душы марылі пра тое, што хутка настане той час, калі вуліцы і нашых гарадоў напоўняць натоўпы замежных турыстаў.

Мы марылі і пры гэтым працягвалі ўважліва слухаць, разглядваць, задавалі дадатковыя пытанні, дзяліліся ўражаннямі. Сяброўскія кантакты ўсталяваліся вельмі хутка. Нават перакладчык не заўсёды быў патрэбны. Часам дастаткова было ўсмешкі, асаблівай інтанацыі ў голасе, выразу твару, погляду. Хаця, безумоўна, калі б не цікавы аповед нашых калег, паўнацэнная беларуска-польская турыстычна-краязнаўчая сяброўская сустрэча наўрад ці атрымалася б. І першыя словы, якія мы пачулі на гасціннай польскай зямлі, былі такія: "Serdecznie witamy na polskiej ziemi!" Люблінскія педагогі не толькі сардэчна віталі, але і сардэчна, захоплена дзяліліся вопытам сваёй работы. Нас яны сапраўды чакалі з нецярпеннем.

## Частка першая

Наша падарожжа можна ўмоўна раздзяліць на дзве часткі. Першая — гэта знаёмства з вопытам арганізацыі турыстычна-краязнаўчай работы, патрыятычнага выхавання ва ўстановах адукацыі Польшчы, распрацоўкай турыстычных маршрутаў. Другая — знаёмства з асаблівасцямі прэзентацыі нашымі суседзямі адметнасцей роднай зямлі. Наколькі выдатна гэта атрымліваецца ў палякаў, што варта пераняць беларусам, каб максімальна наблізіцца да нашых штогадовых планаў па прыцягненні замежных турыстаў у краіну, а дакладней, у нашы далёка не самыя бедныя на архітэктурныя помнікі гарады, раскажам у наступную суботу ў выхаваўчым дадатку "Шосты дзень". Пакуль што першая частка нашага падарожжа: турыстычна-краязнаўчая работа, патрыятычнае выхаванне, распрацоўка маршрутаў. Знаёміцца будзем на прыкладзе дзейнасці люблінскага Аб'яднання эканамічных школ імя Аўгуста і Юліюша Ветэраў і Цэнтра горнага турызму Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства, што ў Кракаве.

## Традыцыі і сучаснасць

Першыя словы вітання на гасціннай польскай зямлі мы невыпадкова пачулі ў люблінскім будынку Аб'яднання эканамічных школ імя Аўгуста і Юліюша Ветэраў. Па-першае, гэта адна з архітэктурных візітовак горада. Па-другое, школа мае багатую гісторыю, традыцыі, у тым ліку традыцыі выхаваўчай работы з навучэнцамі. Што ж, крыху гісторыі, а таксама вопыту.





У XIX стагоддзі ў рамесна-гандлёвым асяроддзі Любліна ўзнікла ідэя стварэння прафесійнага вучылішча, якое давала як агульную, так і працоўную адукацыю. Улічваючы патрэбы жыхароў, люблінскае купецкае таварыства стварыла нядзельна-камерцыйнае вучылішча. Афіцыйна школа пачала працаваць 5 снежня 1866 года. Спачатку вучылішча размяшчалася ў будынку ўрадавай пачатковай мужчынскай школы на вуліцы Езуіцкай. Нядзельна-камерцыйнае вучылішча павышала кваліфікацыю будучых гандляроў. Каб даць моладзі магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю ў політэхнічных або спецыялізаваных вышэйшых навучальных установах, купцы адкрылі ў 1902 годзе сямікласную гандлёвую школу. Школа карысталася папулярнасцю, таму з'явілася патрэба ўзвесці новы будынак. Найбольш актыўны ўдзел у рабоце школы прымалі браты-прамыслоў-







